**ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ**

Усе помнікі гісторыі 3-й катэгорыі

| Назва гісторыка-культурнай каштоўнасці, датаванне, адрас, месца знаходжання, фотаздымак | Апісанне гісторыка-культурнай каштоўнасці |
|---|---|
| **1. Вайсковыя могілкі, 1944 г., в.Узрэчча. Шыфр: 213Д000164**   | Пахаванне 1944 г. Усяго пахавана 215 чалавек. Помнік устаноўлены ў 1959 г. Помнік – скульптура воіна, які стаіць на калене з аўтаматам у правай руцэ і каскай у левай. Скульптура вышынёй 2, 5 м., пастамент – 2,2 м. На пастаменце размешчана мармуровая дошка з надпісам: “Вечная память героям, павшим в боях с немецко-фашистскими захватчиками за честь и свободу нашей Родины в годы Великой Отечественной войны 1941-1945 гг.’’. У пастамента 3 надмагільныя пліты з прозвішчамі 8-мі пахаваных Герояў Савецкага Саюза: Джумаш Асаналіеў, Іван Сямёнавіч Бірукоў, Мікалай Сцяпанавіч Дароўскі, Анатоль Міхайлавіч Звераў, Іван Аляксеевіч Мартынаў, Іван Антонавіч Плякін, Уладзімір Данілавіч Салончанка, Міхаіл Пятровіч Хваткоў. На земляным вале размешчаны 13 пліт з прозвішчамі загінуўшых.<br><br>**Каардынаты: 55,075156 29,346402** |

| | |
|---|---|
| **2. Брацкая магіла савецкіх воінаў, 1944 г., в.Саннікі. Шыфр: 213Д000161**  | Помнік установлены ў 1964 г. Пахавана 99 чалавек. Помнік – скульптура воіна з аўтаматам ва ўзнятай правайруцэ. Вышыня скульптуры 3 м., пастамента - 3,2 м. На пастаменце надпіс: “Вечная слава воинам – героям 1941-1944’’. На пастаменце таблічкі з прозвішчамі загінуўшых. Перад помнікам 3 надмагільныя пліты з прозвішчамі 3 Герояў Савецкага Саюза: Мікалай Дзмітрыевіч Вяснін, Антон Трафімавіч Маслікаў, Булат Янбулатавіч Янтыміраў і грузінскі паэт Мірза Гедэонавіч Гелавані.<br><br>**Каардынаты: 55,095193 29,585398** |
| **3. Брацкая магіла, 1941–1944 гг., г.п.Бешанковічы, вул. Інтэрнацыянальная. Шыфр: 213Д000142**  | Брацкая магіла знаходзіцца на вул. Інтэрнацыянальная г.п. Бешанковічы ў скверы каля школы. Пахавана 198 чалавек, з іх 187 – вядомых. Помнік установлены ў 1956г. Скульптура двух воінаў, у аднаго з воінаў сцяг у левай руцэ, аўтамат прыжаты да грудзі, другі воін стаіць на калене з вянком у правай руцэ. Вышыня скульптуры 2,5 м., пастамента з цэглы – 3 м. На пастаменце мармуровая дошка з надпісам “Вечная память и слава верным сынам нашей Родины”. У аснове пастамента 5 дошак з прозвішчамі загінуўшых. Сярод пахаваных 4 Героя Савецкага Саюза: Хараборкін Георгій Філімонавіч, Лугоўскі Мікалай Пятровіч, Шварцман Маісей Фраімавіч, Спольнік Рыгор Іванавіч.<br><br>**Каардынаты: 55,046568 29,464707** |

| | |
|---|---|
| **4. Брацкая магіла, 1944 г., в.Фролкавічы. Шыфр: 213Д000167**  | На ўсходняй ускраіне вёскі, злева ад дарогі Бешанковічы-Ула. Помнік установлены ў 1969 г. Пахавана 4 воіна, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры вызваленні Бешанковіцкага раёна ў чэрвені 1944 г. Сярод пахаваных – Герой Савецкага Саюза Мікалай Васілевіч Крапцоў-Зайчанка. Помнік – скульптура воіна, які стаіць на калені з аўтаматам у правай руцэ і каскай у левай руцэ. Скульптура вышынёй – 2,5 м. установлена на бетонным пастаменце, вышынёй – 2,3 м. і патсаментам – 2х2,5 м. У аснове пастамента – мармуровая пліта з прозвішчамі загінуўшчых.<br><br>**Каардынаты: 55,197265 29,243564** |
| **5. Брацкая магіла, 1943 – 1944 гады, в.Галыні. Шыфр: 213Д000148**  | Помнік установлены ў 1969 г. Пахавана 71 воіна Савецкай арміі і партызан. Сярод пахаваных – 4 Героя Савецкага Саюза: Александр Піліпавіч Возлікаў, Уладзімір Канстанцінавіч Далгоў, Сцяпан Іларыёнавіч Іларыёнаў, Арамаіз Аствацатуравіч Сяркісян (Саркісаў).<br>Помнік – скульптура воіна з аўтаматам ва ўзнятай правай руцэ. Вышыня помніка – 4 м., пастамента – 3,7 м. Перад пастаментам 5 надмагільнх пліт з мемарыяльнымі дошкамі на якіх размешчаны прозвішчы загінуўшых і надпіс: “Здесь похоронены воины Советской Армии и партизаны, погибшие в период Великой Отечественной войны 1941 – 1945 гг.”.<br><br>**Каардынаты: 55,121749 29,426898** |

**6. Брацкая магіла, 1944 год, в.Дуброва.**
**Шыфр: 213Д000153**




На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі Дубрава пахавана 332 воіна Савецкай Арміі, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашісцкіх захопнікаў у 1944 годзе. Помнік устаноўлены ў 1969 г. Сярод пахаваных – 1 Герой Савецкага Саюза Міхаіл Ціханавіч Кузняцоў.

**Каардынаты: 55,07319 29,753355**

| | |
|---|---|
| **7. Брацкая магіла, 1944 г., в.Клешчыно.**<br>**Шыфр: 213Д000158**<br> | Пахавана 134 воіна, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. ў баях супраць нямецка-фашысціх захопнікаў пры вызваленні раёна. Сярод пахаваных – Герой Савецкага Саюза Міхаіл Панцялеевіч Краўчанка. Помнік установлены ў 1969 г. Помнік – скульптура воіна з аўтамат у правай руцэ. Вышыня помніка 7,5 м. На пастаменце мемарыяльныя пліты з прозвішчамі пахаваных і надпіс: "Вечная слава нашым героям 1941- 1945 гг.''. У аснове пастамента размешчана пліта з прозвішчамі загінуўшых.<br><br>**Каардынаты: 55,009933 29,156605** |
| **8. Брацкая магіла, 1944 г., аг.Ула.**<br>**Шыфр: 213Д000165**<br> | Пахавана 133 воіна. У 1965 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам. Вышыня скульптуры – 3,5 м., пастамента - 2 м. На пастаменце 3 мемарыяльныя дошкі, 2 з іх – з прозвішчамі загінуўшых. На трэццяй – надпіс: "В июле 1941-го, на берегах Западной Двины, ценой своей жизни, закрыли путь гитлеровским захватчикам на Москву воины Уральской 186-й стрелковой дивизии. 298-й Белорецкий стрелковый полк в составе дивизии потерял убитыми и пропавшими без вести 533 воина. Ценою слез и материнской боли, война была оплачена сполна, мы память павших чтим и не позволим, чтоб разразилась новая война".<br>Перад пастаментам 3 надмагільныя пліты з прозвішчамі загінуўшых. Сярод пахаваных – Героі Савецкага Саюза: Рыгор Яфімавіч Бераснёў, Іван Мікалаевіч Бярэзін, Мікалай Іванавіч Мітрафанаў.<br><br>**Каардынаты: 55,225602 29,245569** |

| | |
|---|---|
| **9. Брацкая магіла, 1944 г., аг.Астроўна.<br>Шыфр: 213Д000145**<br><br> | Пахавана 502 чалавека, якія загінулі пры вызваленні Бешанковіцкага раёна, у тым ліку в. Астроўна. Помнік устаноўлены ў 1969 г.<br>Помнік – скульптура воіна з аўтаматам у руках, вышынёй 2,5 м. на жалезабетонным пастаменце, вышынёй 2,3 м. На пастаменце размешчаны мемарыяльныя дошкі з прозвішчамі загінуўшых і надпісам: “Здесь захоронены воины 19-й, 91-й, 334-й Витебской, 235-й, 251-й стрелковых дивизий, 14 танковой дивизии, геройски погибшие при обороне и освобождении Бешенковичского района от немецко-фашистских захватчиков”. Перад помнікам бетонная пліта, на якой размешчаны мемарыяльныя дошкі з прозвішчамі пахаваных.<br>**Каардынаты: 55,137281   29,866467** |